відаў мастацтва ці як крыніцу стварэння іншых твораў (харэаграфічных, музычных ці інш.); пакінуць тыя дысцыпліны па выбары, якія адлюстроўваюць узаемасувязь, узаемадзеянне літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва, скіроўваюць спецыяліста на дасканальнае валоданне мовай у межах прафесійнага маўлення, напрыклад, курс "Стылістыка і культура маўлення", "Інтэрпрэтацыя літаратурных твораў іншымі відамі мастацтва","Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе", "Культура прафесійнага маўлення", "Беларуская драматургія і тэатр", "Мастацкія плыні ў літаратуры ХХ ст."

## УВОДНАЯ ЛЕКЦЫЯ ЯК АДНА З ФОРМ ПРАФАРЫЕНТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ СА СТУДЭНТАМІ

***Лейко Н.А.,*** *прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

У вучэбным плане падрыхтоўкі спецыялістаў па накірунку "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць" курс "Каталагізацыя дакументаў" аднесены да базавых прафесіянальных дысцыплін. Задача курса заключаецца ў авалоданні студэнтамі прафесіянальных ведаў, уменняў і навыкаў у галіне фарміравання бібліяграфічнага запісу, сістэматызацыі і прадметызацыі дакументаў, арганізацыі, вядзення і выкарыстання каталогаў.

Каталагізацыя і класіфікацыя з'яўляюцца асноўнымі інструментамі пры адборы інфармацыі.

Галоўная задача вышэйшай школы на сучасным этапе – забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі, якія маюць адпаведную навуковую і практычныю падрыхтоўку, дасканала валодаюць сваёй спецыяльнасцю і здольныя да творчай дзейнасці.

"Каталагізацыя дакументаў" – адзін з асноўных спецыяльных курсаў. Ён з'яўляецца фундаментам, які садзейнічае паспяховаму вывучэнню амаль што ўсіх дысцыплін бібліятэказнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў.

Вопыт падрыхтоўкі спецыялістаў паказвае, што неабходна пастаянна працаваць са студэнтамі, не толькі асвойваць новы матэрыял, але і вучыць іх саміх шукаць новае, незвычайнае, неабходнае для сваёй прафесіі, ставіць новыя задачы, звязаныя са сваёй прафесіяй. Вельмі добра калі студэнты не толькі выкладаюць, пераказваюць думкі знакамітых вучоных, але і ўмеюць каменціраваць іх, дапаўняць канкрэтнымі прыкладамі з работы бібліятэк, гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значыць вучыць студэнтаў творча працаваць з дакументамі, умець іх выкарыстоўваць на практыцы.

Лепшым вынікам творчай работы з’яўляюцца прапановы студэнтаў, якія бачылі ў бібліятэках лепшы вопыт арганізацыі той ці іншай дзейнасці на практыцы, калі яны выказваюць свой погляд, не пагаджаюцца з аўтарамі некаторых кніг. Гэта сведчыць аб тым, што студэнты праяўляюць цікавасць да прафесіі, хочуць удасканаліць яе, праяўляюць першую творчую ініцыятыву.

На жаль, такіх студэнтаў мала. Таму нам, выкладчыкам, неабходна зацікавіць іх вучэбным працэсам і будучай прафесіяй, весці заняткі так, каб выклікаць у студэнтаў станоўчыя эмоцыі, каб яны паверылі і зацікавіліся тым, аб чым ідзе размова на лекцыі. У першую чаргу гэта важна пры выкладанні спецыяльных дысцыплін. У даным выпадку трэба ўдасканальваць методыку іх выкладання, абавязкова звяртаць увагу на праблемныя пытанні дысцыпліны, неабходнасць пастаяннай самастойнай работы.

Асаблівае значэнне пры вывучэнні спецыяльных дысцыплін неабходна надаваць уводнай лекцыі. У ёй не толькі вызначаюцца аб’ект і прадмет дысцыпліны, мэты і задачы, міжпрадметныя сувязі і іншыя метадычныя пытанні, але галоўная ўвага надаецца паказу развіцця дысцыпліны і выкарыстанню яе не толькі спецыялістамі ў бібліятэках, але і ў іншых галінах навукі. Справа ў тым, што дысцыпліна “Каталагізацыя дакументаў” вывучаецца (у скарочаным выглядзе) студэнтамі не толькі іншых спецыяльнасцей нашага ўніверсітэта, але і іншых вышэйшых навучальных устаноў, а некаторыя раздзелы нашага курса, у прыватнасці, фарміраванне бібліяграфічнага запісу дакументаў неабходна ведаць усім, хто мае дачыненне да навукі, аспірантам і кандыдатам навук усіх галін ведаў, а таксама тым, хто працуе з кнігай: работнікам кніжнага гандлю, выдавецтваў і інш.

Каб зацікавіць студэнтаў сваёй дысцыплінай і, асабліва сваёй прафесіяй, абавязкова трэба ўвогуле звярнуць увагу на тое, што ўсё трэба рабіць з любоўю, тады і вынікі будуць добрыя. Абавязкова ўспамінаю легенду як будавалі сабор у сярэднія вякі ў французскім горадзе Шартр.

Я хачу расказаць вам старадаўнюю легенду. У сярэднія вякі ў французкім горадзе Шартр будаваўся сабор. Цесаны камень, з якога будаваліся сцены, рабочыя ў тачках падвозілі да будаўнічай пляцоўкі.

І вось неяк траім тачачнікам, якія выконвалі аднолькавую работу– падвозілі камень, задалі адно і тое ж пытанне: «Паслухай, прыяцель, што ты робіш?».

Першы рабочы хмура агледзеў таго, хто да яго звярнуўся, і раздражнённа адказаў: «Ты што, аслеп? Не бачыш – камень цягаю на пляцоўку: бадай ён скіс!»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другі сказаў: «Што раблю? Зарабляю на кусок хлеба для сям'і – жонцы і двум маленькім дачушкам».

А трэці выпрастаў спіну, уцер пот з ілба, усміхнуўся і заявіў: «Я будую Шартрскі сабор» [3, с.71].

Адну і тую ж справу можна рабіць па-рознаму. Можно жыць ад выхаднога да выхаднога. А можно інакш. Каб у лепшыя з выхадных дзён дзесьці ў самай патаемнай глыбіні душы мы адчувалі радаснае пачуццё таго, што заўтра мы зноў пойдзем на работу, сустрэнемся з сябрамі і будзем разам займацца патрэбнай справай.

Прыводжу таксама больш даступныя сучасныя прыклады адносін да сваёй прафесіі, што можа даць любоў да прафесіі, адказнасць і добрасумленныя адносіны да сваёй працы. Прыклады знакамітых людзей у галіне бібліятэчнай справы Беларусі сведчаць аб гэтым: Р.С. Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Т.В. Кузьмініч і А.Е. Даўгаполава, яго намеснікі, І.У.Дрыга, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь і інш., якія таксама закончылі наш факультэт, абаранілі дысертацыі і добрасумленна працуюць, з'яўляючыся лепшымі прадстаўнікамі нашай прафесіі. Трэба адзначыць, што яны ганарацца сваёй прафесіяй, а мы ганарымся імі.

Важнейшымі задачамі павышэння якасці абучэння студэнтаў з'яўляюцца павышэнне вучэбнай матывацыі і фарміраванне ў іх зацікаўленасці да прафесіі, да яе авалодання, арганізацыя самастойнай работы. Таму ў час лекцыі неабходна выхоўваць любоў да прафесіі, да сваёй спецыяльнасці. Анкетаванне студэнтаў III курса пацвярджае гэта.

На жаль, тыя змены, якія адбываюцца на сучасным этапе ў галіне культуры, у першую чаргу скарачэнне колькасці бібліятэк і чытачоў накладвае адбітак і на абітурыентаў пры выбары прафесіі – затым нашых студэнтаў. Адлюстраваннем гэтага з'яўляецца адказ на пытанне "Як Вы прыйшлі да прафесіі бібліятэкара?" Асноўны адказ – 47 % складае выпадковасць, 42 % – неабходнасць і толькі 11 % – прызванне, нягледзячы на тое, што ўсе студэнты высока цэняць ролю кнігі ў іх жыцці. Яны падкрэсліваюць, што гэта іх "хобі"; "многа чыталі ў дзяцінстве, таму гэта адыграла вялікую адукацыйную ролю"; "з дапамогай кнігі пашырыўся мой кругазор, яны мяне і вучаць, і развіваюць, і дапамагаюць вырашаць усе жыццёвыя пытанні"; "на днях пачала чытаць кнігу, якая натхніла мяне на жыццё, дзякуючы кнігам я жыву".

Нягледзячы на тое, што не ўсе студэнты выбралі прафесію па прызванні, разам з тым, яны правільна даюць адказ на пытанне "Якія прафесійныя якасці з'яўляюцца галоўнымі і абавязковымі для бібліятэкара?" Студэнты падкрэсліваюць, што гэта: "эрудыраванасць", "камунікатыўнасць", "ураўнаважанасць", "арганізаванасць", "камунікабельнасць", "уважлівасць", "уменне працаваць з камп'ютэрам", "веданне спецыяльных прадметаў", "уважлівасць",

“востры розум”, “цярпенне”, “добразычлівасць”, “добрыя веды”, “увага да чытачоў”, “якаснае выкананне ўсіх работ у бібліятэцы” і інш.

Нас таксама парадаваў адказ на пытанне “Якія асабістыя якасці патрэбны бібліятэкару?” Адказы былі розныя, але ва ўсіх іх адчувалася разуменне сваёй будучай прафесіі. У першую чаргу звярталася ўвага на “ўменне працаваць з людзьмі”, “дабрата”, “сціпласць”, “прыязнасць да чытачоў”, “сумленнасць”, “цярпенне”, “стрыманасць”, “ветлівасць”, “душэўнасць”, “уменне спачуваць”, “разумець чалавека”.

Пры адказе на пытанне “Што лічыце галоўным: работа з кнігай, або работа з чытачом?” 96 % адказалі, што галоўным з’яўляецца работа з чытачом, а некаторыя нават патлумачылі так “работа з чытачом з’яўляецца галоўнай, таму што яна патрабуе ўзаемадзеянне з жывой істотай; таму што без чытача не можа існаваць бібліятэка”. Некаторыя напісалі: “работа з чытачом, але трэба помніць, што важным з’яўляецца і тое, і другое”. Рабоце з кнігай аддалі перавагу толькі 4 %.

Асноўная частка студэнтаў з разуменнем падышла да пытання “Як Вы думаеце адносіцца да чытачоў?” 89 % адказалі, што яны будуць “паважаць” чытачоў, 8 % будуць “любіць”, а 3 % будуць “цярпець”. Вось гэтыя 3 % і насцярожваюць нас, застаўляюць думаць, што трэба рабіць выкладчыку, каб змяніліся іх адносіны да чытача.

Галоўная прычына адмоўных адносін студэнтаў раскрылася пры адказе на пытанне “Што Вы лічыце прэстыжным або непрэстыжным у прафесіі бібліятэкара?” Адказы надзвычай цікавыя, у многім справядлівыя. Прыемна чытаць, калі адказваюць з любоўю і павагай да прафесіі. Напрыклад, “прэстыжная, цікавая работа з “думаючымі людзьмі”, “прэстыжна – любоў да кнігі, яе цэннасць”, “прэстыжна многа ведаць кніг і аўтараў, чытаць іх”. Але, нажаль, тут многа выказана непрэстыжнага ў прафесіі бібліятэкара: “мне не падабаецца вобраз бібліятэкара, які сфарміраваны ў нашым грамадстве”; “непрэстыжна тое, што ва ўмовах прагрэса людзі забываюць аб кнігах”; “зарплата непрэстыжная” – гэта падкрэслівалі 89 % студэнтаў. “Калі будзе большая зарплата, тады ўсё будзе добра”. Але парадавала адна са студэнтак, якая напісала: “На сучасным этапе прафесія бібліятэкара лічыцца непрэстыжнай, але для мяне гэта не так і я з гэтым не згодна”.

На пытанне, блізкае да папярэдняга “Што Вам больш за ўсё падабаецца ў будучай рабоце бібліятэкара?” адказы былі станоўчыя, у большасці выпадкаў канкрэтныя. Сярод іх такія адказы: “работа падыходзіць для дзяўчат”, “стабільнасць”, “падабаецца тое, што бібліятэкары аддаюць людзям свае прафесіянальныя веды”; “усё падабаецца”, “падабаецца парадак у бібліятэцы, няма мітусні”, “работа з інфармацыйнымі рэсурсамі”, “магчымасць працаваць з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяцьмі", "падабаецца тое, што ў бібліятэцы многа кніг, там цікава і можна многа чытаць". Асноўная частка студэнтаў падкрэслівала, што ім падабаецца работа з чытачамі (на абанеменце або ў чытальным зале), адносіны з чытачамі.

Правільна разумеючы сутнасць бібліятэчнай работы, большасць студэнтаў робіць правільны выбар. Яны жадаюць працаваць у бібліятэцы: "бібліятэкарам", "дырэктарам бібліятэкі", "дырэктарам бібліятэкі Акадэміі навук Беларусі, або БНТУ", "у Мінску, у дзіцячай бібліятэцы", "у РНТБ у аддзеле камплектавання або каталагізацыі" і інш. Трэба адзначыць, што асноўная частка выказвае жаданне працаваць у буйных бібліятэках, "не ў маленькай бібліятэцы". Нас засмучае тое, што некаторыя студэнты не збіраюцца працаваць у бібліятэцы, або яшчэ не вызначыліся. Яны пішуць: "хачу быць не бібліятэкарам", "менеджэрам у рэкламнай фірме", "тур-агентам", "не ў сферы культуры, а нешта напрамую звязанае з замежнымі мовамі".

Каб лепш зразумець студэнтаў, выявіць іх схільнасці і інтарэсы было пастаўлена пытанне "Што неабходна змяніць пры выкладанні спецыяльных дысцыплін для лепшага іх засваення, для авалодання прафесіяй бібліятэкара?" Адказы былі розныя, як і самі студэнты. Некаторыя пісалі проста: "усё задавальняе", або "многа ўсяго", "удасканаліць методыку работы са студэнтамі", "адносіны да прафесіі", "у лекцыі прыводзіць больш прыкладаў з практыкі" і інш. Але больш за ўсё студэнты выказалі пажаданняў каб у іх было "больш практычных заняткаў, чым тэорыі", "больш практыкі каб замацаваць тэарэтычныя веды".

Такія адказы склалі 52,8%. Гэта сведчыць аб тым, што нам трэба падумаць як змяніць адносіны да выкладаемых спецыяльных дысцыплін, як зацікавіць студэнтаў сваёй прафесіяй, якім чынам прыклады з работы бібліятэк павінны прысутнічаць на нашых занятках. І галоўнае – сувязь з бібліятэкамі, з іх творчымі праблемамі, і іх рашэннямі, паказваць, як вырашаюцца тэарэтыка-метадычныя і практычныя пытанні развіцця бібліятэк на сучасным этапе, вызначыць іх ролю і месца ў інфраструктуры інфармацыйна-адукацыйнага асяродка, абгрунтаваць неабходнасць комплекснага развіцця бібліятэчнай прасторы з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій для аптымальнай арганізацыі бібліятэчнай і адукацыйнай дзейнасці.

На сучасным этапе з мэтай павышэння вучэбнай матывацыі і паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў неабходна на ўсіх відах заняткаў не толькі вучыць студэнтаў, але і выхоўваць іх любоў да прафесіі, праводзіць прафарыентацыйную работу на ўсіх курсах, дапамагаць студэнтам у выбары месца вытворчай практыкі і свайго першага рабочага месца.

---

1. Гендина, Н.И. Аналитико-синтетическая переработка информации: учеб./ Н.Гендина и др.; науч. ред. А.В. Соколов; координатор проекта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Л.В. Трапезникова. – Санкт-Петербург: Профессия, 2013. – 336 с. – (Издания для профессионалов).

2. Каталогизация. Современные технологии, тенденции и перспективы развития: курс лекций / Селиванова Ю.Г. [и др.]. – Москва: ФАИР: Либнет, 2007. – 215 с.

3. Чешев, В.В. Марксизм и этос капитализма // Идеи и идеалы. – 2014. – № 1 (19). – С.66-76.

# УЖЫВАННЕ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У НАВУЧАННІ СТУДЭНТАЎ: НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ МЕНЕДЖМЕНТ»

***Паўлава С.А.**, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Вялікую ролю на сучасным этапе развіцця грамадства адыгрывае якасць прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста. А гэта, у сваю чаргу патрабуе ад прафесійнай адукацыі пераарыентацыі на прафесійную накіраванасць, на перспектыўную падрыхтоўку маладога спецыяліста, якая стане здзяйсняцца з улікам развіцця вытворчасці, грамадска-сацыяльных запытаў, будзе гнутка рэагіраваць на інтарэсы рынку працы, яго ўмоў і патрабаванняў.

На этапе удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў актуальнай з'яўляецца навукова-метадычная праблема праектавання новых адукацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць высокую якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Гаворка ідзе аб прафесійна-арыентаваным навучанні, якое дазваляе арганізаваць вучэбны працэс з улікам прафесійнай накіраванасці, арыентацыі на развіццё прафесіянальна важных якасцяў будучага спецыяліста.

Існуе шэраг падыходаў да вызначэння практыка-арыентаванай адукацыі ў вну. Ю.Ветраў і Н.Клушына лічаць, што практыка-арыентаваная адукацыя – гэта арганізацыя вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыцы з пагружэннем студэнта ў прафесіянальнае асяроддзе. П.Абразцоў і Т.Дзмітрыенка разглядаюць практыка-арыентаванае навучанне як укараненне прафесіянальна-арыентаваных тэхналогій навучання. якія садзейнічаюць фарміраванню ў студэнтаў тых якасцяў асобы, якія неабходныя для будучай прафесіі. А.Вярбіцкі, Е.Плотнікава, В.Шаршнева звязываюць развіццё прафесійна-арыентаванага навучання з выкарыстаннем кантэкстнага вывучэння непрофільных дысцыплін [1].

Зыходзячы з гэтага ў сістэме бесперапыннай прафесійнай адукацыі можна вылучыць наступныя элементы сістэмы практыка-арыентаванага навучання: вучэбная, вытворчая і пераддыпломная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ